Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.—4 р. на 6 мес.—2 р мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 7 Жніуня 1915 г. № 31

## Камітэт Беларускага Таварыства помачы пацярпеушым ад вайны.

*Адрэс: Вільня Георгіеускі праспэкт № 11. Тэл. 11—92.*

**Камітэт атчынены ад 1 да 3 гадзіны кожны дзень апрача нядзель і сьвят.**

## Крывавая межа.

С-пад Рыгі і Мітавы, праз Коўна, Сувалкі і Асавец, пад Беластокам, Бельскам і Бярэсьцем і далей на палудзень да рэкі Днестра цягнецца, бытцым стужка чырвоная, крывавая межа: яна раздзеляе расейскіе і нямецкіе сілы. І с канца ў канец яе, як кінь вокам, на сотнях вёрст ідзе страшэнны бой.

Крывавая межа памалу, крок за крокам, аддзеляе павет ад павету, горад ад гораду, дзеліць суцэльные народы. Абняўшы Польшчу і Літву, яна ўжо дайшла да зямлі Беларускай і пачынае рэзаць нашы гоні. Адны з нашых братоў астаюцца з гэтаго боку яе, другіе апынуліся або могуць апынуцца за мяжой...

Там, дзе рвуцца бомбы і сьвішчуць кулі, спыняецпа ўселякая культурная праца: людзі думаюць адно аб тым, каб захаваць сваё жыцьцё, каб ператрываць ліхіе дні. Закрываюцца школы, зачыняюцца газэты, або вандруюць з мейсца на мейсцо, з гораду ў горад, — туды, дзе спакайней. Але поруч с тым, як чырвоная стужка пасоўваецца у глыб краю, спыніўшаеся жыцьцё ад'наўляецца з абодвых бакоў крывавай мяжы,—з абодвых бакоў яе чутно біцьцё сэрца народнаго.

Ці далёка ўрэжэцца тая межа ў нашу старонку?

Німа ведама.

Німа ведама, ці далёка і ці на доўга раскіне, разгоніць яна братоў нашых... Німа ведама, „ці збярэмся зноў калі мы ў нашым бедным родным Краю, так як птушкі пасьля зімы“?!.

Але й тут і там—за і перад крывавай мяжой, дзе толькі жыць будзе народ беларускі, мы маемо адну сьвятую павіннасьць працаваць дзеля гэтаго народу, не пакладаючы рук, бараніць яго, як мага, ад крыўд і здзеку, ад уселякіх напасьцей. Хай і тут і там не замірае беларускае жывое слово. Ніхай адвечны гаспадар зямлі гэтай не пакідае яе — дзеля новых паноў.

Пройдуць гады. Ізноў пазелянее чырвоная межа, акрашэная крывёю чалавечай. Ізноў спаткаемся мы на дружнай рабоці для роднай Старонкі. Тады адзін аднаго будзе пытацца: „як споўніў ты сваю павіннасьць перад народам?“ А хто тады ня здолее даць атказ, хто ня здолее сьмела глянуць у вочы таварыша, — таму сорам і ганьба будзе на вечные часы!

# ВАЙНА.

**На Усходнім фронце. (Весткі ад Штабу Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго).**

*4 жніуня.* «У Рыжскім районі і на Якобштатскім напрамку без асаблівых перамен. Пробы няпрыяцеля 2 і 3 жніўня пасунуцца наперад не ўдаваліся. На Дзьвінскім напрамку заўзятая барацьба не спыняецца. Усе атакі немцоў мы адбілі. Пад Коўнай бітвы прынялі страшэнна натужэны і упорны характар. Праціўнік у працягу 2 і 3 жніўня акуратна падгатаваў атаку цяжкай артылерыі усіх вялічын, да шэснаццаціцалёвай ўлучна, і кідаўся ўсімі сіламі, каб заўладаць штурмам узмацаваньнямі левага берагу Нёмана. К вечэру 3 жніўня яму удалося заўладаць адным сільна разрушэным стрэлянінай фортам і прарвацца ў праходы паміж некаторымі другімі фортамі заходняго фронту. Бітва не спыняецца. На левым беразі Верхняго Нарэва у працягу 2 жніўня мы адбілі некольки быстрых атак немцоў на напрамках к Беластоку і Бельску. Такжэ карысна стрымлівалася наступленьне праціўніка паміж рэкамі Нурэц і Бугам Страты праціўніка вельмі значные. На Бугу вышэй мястэчка Янова адбываюцца стычкі найболей аберэгаючых атрадоў, але ў районі Влодавы праціўнік меціцца замацавацца на правым беразі рэкі. У районі Новогеоргіеўска—усіленая гарматняя стрэляніна Праціўнік пусьціў у бітву гарматы самых вялікіх калібраў. 2 жніўня і ў ночы на 3 жніўня немцы зрабілі некольки атак, кіруючы іх найболей на узмацаваньня паміж Нарэвам і левым берэгам рэкі Вкры. На іншых участках нашаго агульнаго фронту без перамен.

На Чорным моры, ў вугольным районі, наша падводная лодка затапіла турэцкі параход з углём».

*5 жніуня.* «У Рыжскім районі і на Якобштатскім напрамку без асаблівых перамен. Пробы непрыяцельскаго флота ніштошыць нашы мінные загароды пры ўходзі у Рыжскую затоку адбіваліся стрэлянінай з нашых караблёў. На Дзьвінскім напрамку у ночы на 4 жніўня і на наступіўшый дзень пробы немцоў перайці ў наступленьне мы адбілі. Пад Коўнай пасьля страшэнных адзінанцаціdзённых бітвоў, каштаваўшых праціўніку вялікіх страт, немцам удалося уцьвярдзіцца у ўзмацаваньнях, распаложэных на левым беразі Нёману. К захаду ад рэкі Есі немцы прабуюць перэбрацца на правы бераг гэтаго урвістаго ручая, гдзе часьць узмацаваньняў знайходзіцца у нашых руках. На правым беразі Нёмана усе узмацаваньня астаюцца ў нашых руках. На фронце Верхняго Нарэва, а такжэ паміж ім і Бугам 3 і 4 чысла бітвы адбываліся с пераменнай карысьцяй. З асаблівым упорам праціўнік вёў атакі на шляхах к Беластоку і Бельску з захаду. На Бугу ў районі чыгункі Седлец—Чэрэмха, адбіўшы наступленьне немцоў, мы зрабілі удачную проці-атаку. Захоплена некольки кулемётоў. У районі Новагеоргіеўска праціўнік не спыняе упорных атак на паўночна-усходні фронт узмацаваньняў, прычым глаўнае напіраньне немцоў скіравана на узмацаваньня, запіраючые лінію чыгункі ад Млавы. На Верхнім Бугу, Залатой Ліпе і Днестры палажэньне без перамен».

(Пта).

**На Каўказкім ффроне.** *За 3 жніўня.* «У Прыморскім районі звычайная перастрэлка. На Ольцінскім напрамку стычкі разведачных атрадоў. У Пассінскай даліні наступленьне турак на Шорходжу спынена, прычым асабліва удачна працавала наша артылерыя. На поўдзень ад Кара-Дэрбента мы бітвою занялі сільную пазыцію турак на гарэ Мірза Ага На Ефрацкім напрамку наша калонна бітвою заняла прускую пазыцію і аткінула турак на захад. За суткі мы ўзялі у палон аднаго камандзіра батальона, 4 обэр-офіцэроў і 300 з лішнім аскероў, адбілі абоз з вінтоўкамі, ручнымі гранатамі і вялікі гурт жывёлы. На рэшці фронта без перамен». (Пта).

**На іншых фронтах** ваенных змаганьнёў нічога важнаго.

## Чародная справа.

Пасьля доўгіх войн народы дзічэюць. Гэта — старая, адвечная праўда. Аб ей трэба заўсёды памятаць і, памятаючы, загадзя бараніць наш народ ня толькі ад экономічнай руіны, але й ад культурнаго развалу.

Не шукаючы далёка, глянем на тое, што робіцца у краёх найблізжэйшых да вайны. Мала таго, што нішчыцца дабро людзей: там, дзе дакацілася ваенная хваля, задзержываецца грамадзкае жыцьцё, задзержываецца ўселякая культурная работа і шырыцца поўнае панаваньне цемнаты—найгоршаго ворага народу. Пуста ў школах. Німа каму вучыць, німа дзе вучыць. Мінае год, мінае другі—і вось ужо двух школьных выпускоў не хапае... Два гады змарнаваліся дзеля навукі, дзеці падрастаюць і йдуць на работу, бо-ж работнікі ўсе—у салдатах, а як ужо уздзеў сабе на шыю ярмо, дык яго ня скінеш, ня пойдзеш у школу, калі трэба кусок хлеба здабываць!

Зніштажэньне прасьветы—гэта страшней, чым кулі і бомбы. Ад куль і бомб гіне грамада народу, але на іх мейсцо прыйдуць новые работнікі. Але калі тые заступнікі іх растуць у цемры, калі ў іх душы гіне абраз Божы і сьведомасьць чэлавеча, дык ажно страх знімае, што гэткіе людзі будуць жыць доўгіе гады, мо' будуць жыцьцём нашым кіраваць...

Яно-ж ясна, як Божы дзень. Ясна, што гіне культура.—І у абарону яе павінны мы ўсе устаць.

«Што-ж рабіць, — скажэ мо' каторы, — калі німа школы, калі настаўнікі павыежджалі, а ў класах гуляе вецер і сьвішчэ праз шчыліны?»

Атказ на гэта кароткі: хто толькі дуж, хто толькі можэ, ніхай дома вучыць дзетак сваіх, калі перад імі зачынены дзьверы школы. Хай навучацца хаця бы толькі граматы: добра й гэта, бо грамата — гэта ключ, каторы ахвочым людзям атчыняе ўсе скарбы сусьветнай культуры.

Наймайце настаўнікоў самі: ніхай ходзяць с хаты ў хату, вучачы вашых дзяцей. А мо' знойдуцца ў нас людзі, каторые пааткрываюць прыватные школы там, дзе пазачыняліся казённые?..

Гэтымі днямі Камітэт «Беларускаго Таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны», радзіўся аб тым, каб у Вільні, дзе стоўпілося багата беларускіх высяленцоў з вёсак і мястэчак, аткрыць для іх дзяцей *беларускую бурсу*,—значыць, такі прытулак, у каторым займаліся бы навучаньнем дзяцей. Гэта — дужа пільная справа, толькі споўніць яе вельмі трудна: нехват грошы. Няўжо-ж ня знойдзецца ніводзін чэлавек, каторы, маючы грошы, ахвяраваўбы на такую «бурсу» колькі тысяч рублёў? Няўжо-ж не наладзяць яе—апрача Вільні—і другіе гарады нашаго краю, дзе наплываюць беларускіе высяленцы?

Калі нашае грамадзянство не загубіло ўсіх сіл сваіх і энэргіі ў часі вайны калі яно—дый увесь народ—разумее страшэнную шкоду, якую нашай старонцы робіць закрыцьце і эвакуація школ, дык (- трэба спадзевацца) ў нас закіпіць усюды спорная работа дзеля

прасьветы народу. І вырве яна народ беларускі з абоймаў цемры, каторая ўжо працягівае свае рукі, каб скаваць путамі душы будучых грамадзян Зямлі нашай — дасць Бог, вольнай ад ворагоў, ад здзеку, ад уціску.

Прасьвета — найлепшая самаабарона народу, каторая пазволіць яму ператрываць цяжкі час ліхалецьця. Дзеля яе не павінны мы нічога шкадаваць!

а—н—а.

## Нашы жальбы.

Далёка адбіваюцца адгалоскі вайны па нашых вёсках. Людзі зьбіраюцца прысьвяткамі у грамадкі, гукаюць пра вайну і выказываюць адзін аднаму свае жальбы. Тут і стары дзед, і сівенькая бабуля, і гаспадары нашы вясковые—астаўшыеся «салдаткі», маладзіцы ды, выправіўшые сыноў сваіх, матулі сіратлівые. Хі мала тут пра што гаворуць і кожнаму ахвота пачуць навіну.

Тут і лісты чытаюць з вайны, і газэткай цікавюцца. Жалюцца на сваё нялёгкая жыцьцё... У каго жонка пры сьмерці, а доктара німа скуль і за што паклікаць; у каго дзеці зрабіліся калекамі, валяючыся з лавак, калі ў гарачы дзень асталіся без догляду дома; у каго апошні конік паў, а купіць німа за што, дастаць недзе, а час гарачы;

Вось і думай, брацеǃ Пакруці галоўкай тут у нашым горы, ды хоць плазмам расцягніся, хоць галасі, хоць біся, нічога не парадзіш... А тут гэта вайна...

Ой ты, жальба, як даўно пануіш над нашай зямлёй Беларускай! З даўных вякоў спавіла старонку у свае сьлязлівые пялёнкі, атуліла народ наш доляй нялёгкай. А ці мала адбывалася войнаў чужых у нас? Ад удзельных князёў беларускіх ліеца кроў па нашай зямлі. Біліся Маскоўцы са Швэдамі, — курганы-помнікі тых бояк асталіся да нашых дзён. Сто год таму прайшлі па ўсей нашай зямлі, у перад і ў зад, полчышча французскіе, аставаліся руіны, ды сьцежкі усьцілаліся трупамі.

Цяпер ізноў над нашай краінай падняты нагострэны меч, зазьвінелі шаблі, раздаецца страшны гарматны гул... земля дрыжыць, ліецца кроў, сьмерць косіць свае ахвяры. Хто бліжэй к гэтаму вогнішчу с сялян, кідаіць свой скарб і з душой уцекаіць куды вочы глядзяць. Іх цэлые тысячы, абдзёртых, галодных—ніўчым непавінных... Ім трэба помач.

З гэтымі пакутнікамі, мы павінны раздзяліць апошні кусок нашаго чорнаго хлеба, гэта нашы браты і Бог і мус кажыць памагчы ім чым можна. Пасылайце помач у «Беларускі камітэт па аказаньню помачы пацярпеўшым ад вайны» і ў яго аддзелы, а дзе такіх німа, старайцеся аткрыць іх. Памагаючы адзін аднаму, пераясём і на гэты раз ліха. Загараюцца новые аганькі у грамадзян Беларусі, якіе асьвецюць вольны шлях да лепшаго жыцьця нашай старонкі; гора і жальбы адлятуць ад нас і ўперадзі аткрыецца сьветлы прастор.

**Міхалка Скарэўскі.**

## Нашы гарады.

### III Вільня. *)

«Польшча квітнеть лацінаю,
«Літва слынеть русчынаю:
«Без тэй ў Польшчы не прабудеш,
«Без сей ў Літве блазнам будеш.

Гэтак характэрызуе невядомы аўтор XVI сталецьця культурны стан Літоўска-Польскай дзержавы. І трэба сказаць, што характэрызуе даволі верна. Бо хоць Літва і Польшча злучыліся у адну дзержаву, з аднэй пануючай асобай, але національная культура у кожным гасударстве была свая асобная. У Польшчы культура развівалася на ўплывах лацінска-нямецкіх і ў мове лацінскай, — у Літве на ўплывах грэко-візантійскіх і ў мове славяно-рускай, каторая што раз болей набліжалася да мовы жывой, народнай-беларускай. Сталіца Польшчы—Кракоў быў прэдстаўнікам культуры польскай. Вільня трымала сьцяг культуры беларускай. Вільня ня толькі проціставляла культуры лацінска-польскай радзімую культуру беларускую, але і чыніла ей атпор выковываючы у сябе національную і гасударственную мысль. У радох паборнікоў за національную мысль у XVI сталецьці мы бачым усіх лепшых людзей, якіх мела літоўская дзержава у тые часы. Змаганьне за радзімую, беларускую культуру вялося з вялікім упорствам і заўзятасьцю у Вільні да палавіны XVI сталецьця, а на схілку яго атпор пачаў слабець. Дармо Леў Сапега, муж вялікай навукі і значэньня у гасударстве, у прадмове да «Статуту Літоўскаго» стараецца тхнуць гарт у душы сваіх суграмадзян, прамаўляючы да гордасці національнай народу, дармо сам статут засцерэгае, што «пісар земскі маеть по руску літеры і словы рускімі усе лісты і позвы пісаці»,—адступніцтво ад роднай культуры пачало быць што дзенным зьявішчам. Бліскучае панство вырэкалося роднай мовы і культуры каб быць бліжэй да лаціна-польскаго каралеўскаго двара; падпанкі—каб быць бліжэй паноў.. Ад вярхоў да нізоў, праз адступніцтво, перэлівалася кроў з беларускаго національнаго організму—у польскі. У значнай меры спрыяла гэтаму адчыненая на Захад праз Польшчу, дарога для новых ідэй. На Захадзе тады ішло змаганьне за новые формы жыцьця, буяла рэформація, тварыліся новые рэлігійные сэкты; пачынаўся век паважаньня асобы, людзкаго аднош эньня чэлавека да чэлавека. Усе тые новые думкі з Захаду, праз Польшчу шырокай хваляй ліліся у Літву, захоплівалі душы лепшых людзей і пацягалі іх за сабой адрываючы ад роднаго пня і змаганьня за національны організм. Дзякуючы самай шырокай толеранціі каля каралеўскаго двара у Вільні гуртаваліся выдатные сэктанскіе заходна эўропэйскіе сілы і перэцягалі на сваю старану літоўска-беларускую знаць Гэткім парадкам неўзнаку пытаньня веры, заступілі пытэньня національные. Што было выдатнейшаго у краю рынулося з галавой у сэктанскіе навінкі, а абарона національных цэннасьцей натуральным парадкам пераходзіла у рукі мала-рухаваго консэрватыўнаго і неўплывоваго і непрактычнаго у дыплёматычных арканах мешчанско-народнаго элемэнту. Рэлігійнае змаганьне XVI сталецьця адрываючы ад національнаго організму выдатнейшые сілы, падгатаўляло упадак беларускай націі. Віленскіе муры былі сьведкамі героічнаго змаганьня, распачліваго высілку беларускаго народу за свае національные цэннасьці і пагалоўнаго адступніцтва паноў і падпанкоў ад роднаго народу, звычаёў і абычаёў яго, які працэс адбываецца ешчэ і цяпер за нашых часоў, на нашых вачах.

І ўсё ж такі на XVI сталецьце прыпадае найбольшы расцьвет Вільні. Змаганьне національнае і рэлігійнае прымушало людзей думаць і працаваць дзеля абароны

* Гл. «Н Н.» № 24, 25, 27.

# ПЯТРУСЬ.*)

Адзін толькі дзень астаўся да Каляд, і ўсе стараліся, каб трохі агледзіцца к сьвяту. Янук с Пятрусём натрэсьлі трушанкі, а Мацей там нешта ўсё ў хаці пароўся.

— Ды я табе і ўперад казала, што Васіль будзе добры работнік, — казала Алена Мацею, пякучы раніцай бліны:—кепска, што ты не паслухаў мяне ды вясной не ўзяў яго, а то вось наймалі чэлавека.

— Каб-жэ гэта веданьне!—скрывіўшы на бок галаву і пускаючы праз зубы дым, адазваўся Мацей: — я й так думаў, што з яго нічога ня будзе.

— Ты кожны раз гэтак, — загарачылася Алена, — ніколі не паслухаеш, што я табе кажу, а пасьля толькі ўсё: «каб-жэ веданьне, каб-жэ веданьне!» Толькі ўсё гэту люльку й пыхкае, ніколі і з зубоў ня выпусьціць.

— Дык што люлька? — бытцым сумысьля пусьціўшы кучу дыму, адазваўся сьмяючыся Мацей: — люлька тут нічога не замінае. Я хоць люльку куру, затое не валяюся пад плотам, хоцьбы гэтак, як Язэп Сялючок. Вось, пажыла-б ты з ім, дык тады-б ведала па чым фунт ліха.

— Ну, годзі ўжо, бо ты ўжо пачнеш тутака зьбіраць Язэпоў ды Пятрукоў. Ось лепш схадзі зацягні ў хлеў карыта, а то кормны парсюк ніяк ня есьць на дварэ,—трэба будзе ўжо загарадзіць яго, ці што.

— Вы бабы кожны раз гэтак. Што-ж ты зробіш. На тое вы бабы — вам скажы слова, дык вы насыплеце цэлы мех,—чухаючы патыліцу, казаў Мацей: — ніхай будзе па вашаму. І, націснуўшы шапку, пайшоў на двор.

V.

Вось ужо й апошні дзень перад Калядамі прайшоў. З раніцы мароз быў ня крэпкі, але па захадзі сонца, бытцым сумысьле пачаў крапчэць, ня хочучы, знаць, каб моладзь бегала па вуліцы з зьвяздой ды калядавала. На вёсцы з усіх коміноў ішоў дым—гэта бабы пачалі паліць у печах, каб напячы бліноў і зварыць куцьцю. Дзеўкі прыбіралі ў хатах, мужчыны аглядаліся па дварэ, — адным словам, усе радаваліся гэткаму вялікаму сьвяту, як Каляды, і ўсе зьбіраліся яго сустрэчаць.

Ня ўсьпелі Янук с Пятрусём павячэраць, як у хату прыбеглі хлопцы і сталі зваць іх ісьці калядаваць, расказваючы, хто там будзе, куды с пачатку пойдуць і якіе штукі будуць рабіць.

— Мне, нешта, сягоньня няхочыцца,—адазваўся Янук, вылазючы з-за стала: — неяк галава баліць.

І ён нехаця стаў надзеваць шапку й кажух.

— Пятрусь, а ты пойдзіш з намі?—спытаў ён у Пятруся, бачучы, што той яшчэ сядзіць за сталом.

— А вось, зараз, пачэкай трошкі,—уплетаючы селедца з бульбай прабурчэў Пятрусь:— вы йдзіце, а я вас даганю.

І хлопцы раптам рынуліся, як авечкі, ў дзьверы, пусьціўшы ў хату, бытцы дыму, халоднага паветра.

— Вось які ты дурны, Янук! Чаму-ж ты ня хочэш ісьці?—шапнуў таварыш Януку, выйшаўшы ў сенцы: — там-жэ й Кацярына будзе.

Янук нічога не сказаў, але па яго вачах відаць было, што ён ідзе туды толькі для гэтаго. Тым часам на дварэ ўжо сьцямнела. Ўсё неба было ўсыпана зорачкамі. Мароз крапчэў. Чутна было, як на канцы вёскі крычаць і сьмьюцца хлопцы і дзеўчаты, ходзючы за звяздой.

Параўняўшыся с хатай Антося, бацькі Кацярынінаго, Янук сказаў хлопцам, каб яны йшлі далей, а сам падыйшоў к вакну і, пахукаўшы на шыбу, стаў глядзець, што робіцца ў хаці. У хаці нікога не было, толькі адна Кацярына сядзела каля стала й завязвала хустку—знаць зьбіралася на вуліцу. Ня доўга думаючы, Янук атчыніў брамку і пайшоў на двор. Ўвышоўшы ў сенцы, ён пачуў бытцым Кацярына з некім гаворыць. Ен хацеў вярнуцца, але нейкая другая сіла штоўхала яго ў хату, — бытцым ў вадно вуха хто шаптаў: «эй, вярніся!» а ў другое—«йдзі, йдзі, ня ўжо ты вернішся?» Дзьверы ціханька атчыніліся, і Янук ужо стаяў ў хаці каля парога.

Кацярына сядзела перад люстэркам і зачэсвалася, падняўшы ў гору поўные, заголяные/ па локці рукі. Янук, бытцым заварожэны, стаяў і глядзеў, як выгібалася Кацярына і, як у ва сьне, ён ціханька падыйшоў к ёй і пацалаваў.

Кацярына ўздрыгнула й закрычала, але ўбачыўшы, што гэта Янук, толькі пакруціла галавой ды сказала:

— Як ты скора пранюхаў, што нікога дома німа!—і ізноў пачала прыбірацца.

Янук ня ведаў, што казаць і што рабіць, і толькі глядзеў на Кацярыну.

— Ну, чаму-ж ты нічога не гаворыш? — адазвалася да яго Кацярына:—прыйшоў і сядзіць, усёроўна, як без языка... Расказвай, дзе быў, каго бачыў, хто пайшоў калядаваць?.. Ну... кажы!..

Яна абхапіла яго за шыю і стала глядзець у вочы.

— Якая ты харошая! — адно толькі мог прамовіць Янук.

— І ты харошы... праўда?—і яна стала тармашыць яго і сьмеяцца...—Ну давай пацалуемся!.. Хочыш?.. Ну?..

І, не даждаўшыся, пакуль ён скажэ: «ну», яна моцна пацалавала яго і сьмяючыся, стала завязываць хустку.

Ў гэты час на вуліцы пачуўся крык і сьмех і цэлая куча хлапцоў і дзеўчат з гоманам уляцела ў хату.

— Аа!.. вось дзе яна!.. Вось яна с кім тутака разселася! —закрычалі дзеўчаты: — мы яе ўсё чэкаем, а яна тут вунь што! Падабрала сабе хлопца ды мучыць: сама ня йдзе й яго не пускае!

— Дык мы-ж нічога... мы хацелі йсьці,— адгаварываўся Янук: — я толькі зайшоў, каб пазваць ды разам ісьці...

Ў гэты самы момэнт ён убачыў, што на Кацярыну с кутка пазіраюць нейчые бліскучые вочы. Прыглядзеўшыся лепяй, Янук ўбачыў, што гэта Пятрусь. Ды й сама Кацярына, зірнуўшы на яго, бытцым засаромялася, і адвярнуўшыся, стала надзеваць куртку.

— Ну, хутчэй, крычалі дзеўчаты на Кацярыну,—бяры хустку ды пойдзім, а то й так з-за цябе столькі прасядзелі у хаці! І патхапіўшы яе пад рукі, яны ўсе разам рынуліся ў дзьверы і як бачыш былі на вуліцы.

Не вясёлы вярнуўся Пятрусь да дому, навет з Януком нічога не гаварыў — ўсё маўчаў.

І вось с тэй самай пары, як Пятрусь

*) Гл „Н. Н.“ № 28, 29 - 30.

сваей праўды і з гэтай прычыны у Вільні у тые часы было многа школ і друкарэнь. Розные сэктанскіе уцекачы з Заходнай Эўропы,—падчас людзі незвычайнаго розуму і высокай асьветы,—станавіліся кіраўнікамі гэтых школ і шырылі сьвет навукі у краю, а такжэ былі прыцягаючай сілай для выдатнейшых людзей. Вільня засялялася значцю краёвай і чужой, забудовывалося аздобнымі будоўлямі і расшыралося. Чысло жыхароў у Вільні пад канец XVI сталецьця даходзіло 200,000 душ. Як, князь фінляндзкі, сын Густава Вазы, калі уезджаў у Вільню (с Погулянкі) быў здзіўлен пышнасцю места і казаў. што гэткіх мест ён не шмат бачыў у сваім жыцьці.

Упадак Вільні пачынаецца ад часу каталіцкай рэакціі і гасударственаго змаганьня з рознаверцамі. Барадзьбу з рознаверцамі распачалі Езуіты пад канец XVI ст. І хоць у гэтым часе заснавана была у Вільні першая вышэйшая школа—Акадэмія, але і само места і край мала памалу пачынае кланіцца да упадку і пакрывацца цьмой чэлавеканенавістніцтва.

**Ю. В.**

(Далей будзе).

---

# Маленькі Фэльетон.

### Ці будзе ўзноў?

Я вярнуўся с працы... Ломіць плечы, рвець нешта рукі, у грудзях дзергае... І як ня будуць балець косьці, калі з раньня да вечэра ўсё цягаўся, ды ламаўся. Пахлебаўшы якой небудзь стравы, дужэ добра крыху аддыхнуць. Супакоіцца кроў, думкі нахлынуць, ды якіе яшчэ: думкі аб родных вёсачках, якіе пакінуў я ў восень, аб таварышах, думкі аб жыцьці... О, думкі даражэнькіе! хоць з вамі іншую часінку пажывеш і вы троху якбы укалышыце мяне... Чужая старонка, чужая стрэха, незнаёмые людзі...

Ляжу. Ціха ў хаце, толькі гадзіннік: «цік цік, цік цік», ды пракрычыць, як лясун ноччу ў цёмным лесі, машына. Яна блізенька бегае каля маей квартэры і будзіць мяне часта сваім крыкам. Пабегла пад маю старонку. Негдзе павезла сонных людзей, можэ дужэ хворых, ці пакрыўджэных, ці радасных, а можэ паехалі салдацікі на крывавые змаганьня.

Ляжу. Увайшла ў хату гаспадыня-старушка. Охаець, ўздыхаець цяжка,—замарылася. Вады прынесла, дроў прыгатавала, накарміла парасё... Трэба, што-ж зробіш, німа у яе ні радні, німа нікога. Во і капошыцца, сагнуўшы плечы, працуе. Аранічкай ўсё моліцца Богу, ды Маці Божай. Чутна, як яна просіць Мікалая Угодніка заступіцца перад Богам за ея душу. Моліцца сьлёзна. Я ведаю жыцьцё гэтай старушкі, ведаю як яна змалку дзён працавала, цярпела, мучылася, такіе несла мучэньня, што і ня паверыць, і мне жутка робіцца, што у такіх нават людзей могуць быць грэхі.—А што-ж тады будзе з другімі? — думаецца, але я перэбіваю бабульку.

— Бабулька, што гэта ты так шчыра молішся Богу? У цябе ж зусім і грэхоў німа!

— Якжэ, мілы, не маліцца? А грэхі у ва ўсіх ёсьць.

— Бабулька,—гавару я ўзноў,—грэхі ёсьць у тых, хто жыве багата, да сытна, хто працуіць мала, хто па сваей сытасьці часта не бачыць, як даводзіць другіх людзей да сьлёз, хто не жалеіць другіх, хто любіць аднаго сябе. А ты-ж, бабулька, ўвесь свой век працавала, ніколі нікога ня скрыўдзіла.

— Мілы мой, харошы, ты праўду гаворыш, ды ты ня ведаеш, што у мяне дужэ многа грэхоў, ад гарэлкі. Мужык мой піў злосна і я мучылася ды грэшыла ў, жыцьці. Гарэлка — гэта гадзюка, поўзала па сцежцы нашаго жыцьця і ва ўсе шчэлінкі пускала атруту. Ой, страшна цяпер і падумаць! Каля пяцьдзесят гадочкоў я грэшыла цераз яе. Ды як яшчэ! Німа здаецца нічога на сьвеці паганей ад гэтой атруты. Вось, Янук, міленькі, ня пій гарэлкі ніколі. Ня трэба!..

— Бабулька, пасьля вайны гарэлкі ня будзе,—гавару я.

— Дай-то, Божухна, Царыца Нябесная!—уздыхаіць бедная старушка: — А можэ Бог і пошлець міласьць, змілуецца над людзьмі, бо іншые не жывуць век, а мучуцца... Ды ці так гэта будзе, як ты гаворыш? А як можэ «будзе ўзноў?»—троху памаўчаў-шы, загарыла бабуля.

— Ня будзе узноў, — угаварываю я старую.—Ня будзе!

— Ой, як будзе слаўна! Шчасьлівы, хто будзе жыць цяпер!

І бедная кабнцінка ціха-ціха заплакала. Я не трывожыў далей ран бабулі, бо можэ яна ўспомніла мінуўшые гадочкі свае, якіе пражыла с п'яным мужам ў беднаце... ўспомніла горкае жыцьцё, труднае, крыўднае, жыцьцё «мучэльніцы».

— Якжэ я іншы разок сумяеваюся, думаю, разачароўваюся!.. Не! Трэба туга дзержацца за жыцьцё, трэба цярпець, спадзевацца, бо ёсьць-жэ жыцьцё тут, ёсьць, ёсьць нейкі крыж!.. І засынаю я з думкамі аб жыцьці, з верай ў жыцьцё...

**І. Дабранец.**

---

* * *

Як Базыль у паходзе канаў,
Ўсё старонку сваю спамінаў.
. . . . . . .
—Вы прашчайце, прашчайце, шнуры,
Вы прашчайце, негараные!
Мне вас болі ужо не гараць,
Буйным збожэм на зарэ не засеваць.

—Не пабачу я цябе, цёмны луг,
Поле чыстае, раздольнае!
Мне па вас ўжо ніколі не хадзіць
Мне зялёнай травы не касіць.

—Разстаюся я с табой, шчыры бор,
Пушча цёмная, драмучая!
Мне твой шум ужо болі ня чуваць,
Мне высокіх сасон не рубаць.

—Ах, прашчай ты, сямейка мая,
Вы прашчайце, таварышы!
Ўжо ня прыйдзецца да сэрца прытуліць,
Пасядзець, пажартаваць, пагаманіць.

—Гэй, чалом табе, чалом, Беларусь,
Уся старонachка бяздольная!
Не забыў твой сын сваей маці,
За цябе у зямлі яму лежаці.
. . . . . . .
Як Базыль у паходзе канаў,
Усё старонку сваю спамінаў.

**Максім Богдановіч.**

---

## Кліч.

Гэй, на волю, на разлогі
Ціхіх далёў і палёў,
Дзе ва ўсе канцы сьвятоў
Леглі вольные дарогі,
Дзе без хітрыкаў, праўдзіва
Колас гутарку вядзе
І дзе дуб стары гудзе
Не лісьліва, не фальшыва,
А сваей старой гудою,
Як Бог ў душу палажыў,
І дзе ўжо красу раскрыў
Луг прасторны над вадою!
Гэй, туды, дзе неба з долам
Абняліся, як браты...
Хоць на міг забудзеш ты
Гэты зык пусты і шолам.

**Якуб Колас.**

---

убачыў Кацярыну ды цэлы вечар ўсё каля яе й вертаўся,—Янук адразу прыкмеціў, што яна, неяк, пераменілася да яго. Бывала, ўперад пойдзіш к ёй—сьмеху, гоману, вясёласьці цэлая куча, а цяпер дык яна ні-то саромяецца яго, ні то баіцца. Усё болей маўчыць, а то дык кажэ, што ёй німа калі гуляць або галава баліць.

Хлопец прост с твару зьмяніўся; стаў нейкі забыўчывы, прапала ўся, якая была, яго вясёласьць, с кожным днём усё болей худзеў і сумнеў. Алена нават ужо й да варажбіткі хадзіла, і пярэпалохі яму выкурывала, і к папу зверталася, — нічога не памагала. Нават сам Мацей прыкмеціў, што з Януком кепска, але ўсё маўчаў: думаў, што гэта ён так сабе...

— Што табе, Янук?—пытае, бывала, Мацей ў яго: — ці табе што баліць, ці ты так чаго?

— Ды мне нічога!.. Што вы, тата?.. Мне нічога не баліць. Сьцісьне плячыма й пойдзе.

Адзін толькі Пятрусь ведаў гэту прычыну, аж пакуль аднаго разу сам, як кажуць, ня «выскачыў с крапівы».

Справа была летам. Мацей толькі, што кончыў ўстаўляць дзьверы ў новую хату. Не было толькі клямкі. І вось ён успомніў, што ў Антося Кудзелі, ў Кацярынінаго бацькі ён бачыў зусім яшчэ новую клямку, каторую Антось нават абецаў яму аддаць, бо яму самому ня трэба было.

— Ведаеш, што, сынок, — зьвярнуўся ён да Янука, — «зьбегай ты да Антося і папрасі ў яго клямку—ён казаў, што яна яму не патрэбна, а вось нам дык якраз-бы згадзілася; заўтра можэ пяройдзім у новую хату.

— Я, тата, зьбегаю, — выскачыў наперад Пярусь,—а Янук ніхай тут прыбівае палічкі, бо я ня ўмею.

— Раз да цябе ня п'юць, дык не кажы «на здароўе», — сказаў Мацей, злосна пагледзеўшы на Пятруся. Бацька стаў ужо дагадавацца, што тут такое і чаго Янук гэтакі хмуры. Вось уперад, бывала, дык яны с Пятрусём—як блізняты, а цяпер дык усероўна, як чужые. І ён павярнуўся й пашоў на гумно, а Пятрусь пачаў прыбіваць палічку.

— Я вечэрам, тата, схаджу, — крыкнуў Янук,—а цяперака кончым тут у хаці.

Але Мацей ня чуў гэтаго, бо ён ужо далёка быў і нешта гаварыў с суседам, махаючы рукамі.

Трохі пачэкаўшы, зайшло й сонцэ, толькі йшчэ стрэхі хат ды вярхі бяроз і ліп бытцым золатам, былі абліты апошнімі сонечнымі праменьнямі.

— Ну, годзі вам там ужо стукаць—ідзіце вячэраць! — крыкнула Алена: — заўтра кончыце.

— Што-ж, вячэраць, дык вячэраць,—прабурчэў Пятрусь і, не сказаўшы нічога Януку, пайшоў у хату. Мацея ні было ў хаці, толькі адзін Алесь сядзеў за сталом.

— А дзе-ж Янук?—спытала Алена ў Пятруся,—чаму-ж ён не йдзе?

— Зараз прыдзе, атаказаў Пятрусь і пачаў знімаць капоту.

Тым часам прыйшоў і Янук. Алена падала вячэраць, а сама стала класьці ў печ дровы. Янук с Пятрусём і Алесь спалі ў таку, куды, павячэраўшы, яны зараз-жэ й пашлі.

Ноч была цёмная, харошая, і Янук не пайшоў яшчэ спаць, а выйшоў на вуліцу і сеў на прызбе. Толькі што ён сеў, як у садзі нешта хруснула і нейкая цёмная хвігура, піраскочыўшы цераз плот, шмыгнула ў гумно суседа Антося Кудзелі. Бытцым нейкая сіла штурханула Янука падняцца й пайсьці паглядзець. Ціханька падыйшоў ён к плоту, абыйшоў каля току і стаў пад густым вішнёвым кустам, прысланіўшыся к плоту.

— Ціха!—пачуў ён нейкі шопат:—тут нехта ходзіць.

— Даражэнькая мая, німа нікога. Гэта табе так здаецца,—адазваўся нехта шопатам:—чаго табе баяцца, калі я тутака с табою!

— Я ня ведаю, Пётрачка, што гэта са мной робіцца цяпер. Мне здаецца, каб ня было цябе, дык бы ні аднаго дня не жыла я на сьвеці.

— А Янук? — засьмеяўся нехта грубым голасам.

— Пётра! Чаму ты кожны раз робіш прытычкі ім? Няўжо я табе абрыдла? Няўжо ты мяне ня любіш?

— Кацярынка мая, дарагая! — ізноў прамовіў нехта мужчынскім голасам:—ніколі цябе не пакіну! І ў цемнаце чутна было, як яны цалаваліся.

Як анямелы, стаяў Янук каля плоту. Пазнаў ён.. пазнаў, хто гэта скакаў цераз плот.. пазнаў ён гэты голас, каторы зімою яму гаварыў: «і ты харошы! Праўда? Ну, пацалуемся!» Галава яго закруцілася і ён захістаўся. Пад нагу папала нейкая трэска й моцна хруслула.

— Ой! — крыкнула Кацярына, бо гэта яна сядзела с Пятрусём, і яны хутка схаваліся ў паветку.

Хістаючыся, як п'яны, ўвыйшоў Янук у ток і як сноп паваліўся на сена. Ня помніў ён, як ён спаў і дзе спаў, толькі помніў раніцай, што ўсю ноч ён, здаецца, падаў ў нейкую яму... хапаўся за плот... плот трашчаў і ён прачыхаўся.

— Што с табой, Янук? — спытаў ў яго Мацей, як ён на заўтра прыйшоў ў хату.

— Ды нічога, тата: галава, нешта, баліць—мусіць ад гарачыні, — бытцым нехаця прамовіў Янук.

Алена нічога не сказала. Але ўбачыўшы, як упалі ў яго вочы і які белы ён зрабіўся, ў яе бытцым нешта адарвалася ў сярэдзіні.

Адзін толькі Пятрусь нічога й ня думаў. Ен ужо адважыўся на ўсё. «Або пан, або прапаў»,—думаў ён сабе.

### VI

Быў хмурны асеньні дзень. Дзе-ня-дзе толькі на небі былі кусочкі сьветлага праблеску, ды й тые што хвіля закрываліся хмарамі, каторые адна за аднэй сунуліся над зямлёй. З раніцы пачынаў йсьці дошч, а к вечару дык і зусім разыйшоўся. Гдзе-то высока крычалі гусі й жоравы, каторые ляцелі ў вырай. Над вёскай Боркамі цэлай кучай круціліся вароны й галкі, бытцым чуючы нейкую бяду.

Як сумна было на дварэ, дык гэтак сама ня весяла было і ў хаці Мацея. Каля ганку стаяў запрэжаны конь — тая самая жаробка, што Янук некалі яе пасьвіў; а ў хаці была таўкатня і гаманіна: гэта Янук зьбіраўся на вакзал, бо яго ўзялі ў салдаты.

**С. Вірыло.**

(Канец будзе).

